

**СЕМЯНЯКА Валянцін Міхайлавіч**
**(10.07.1963 г.)**

Нарадзіўся ў вёсцы Лыскава Пружанскага раёна. Вучыўся ў Цяглевіцкай сярэдняй школе. Скончыў Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я. Купалы, Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Працаваў настаўнікам, дырэктарам школы, начальнікам аддзела адукацыі, намеснікам старшыні Зэльвенскага райвыканкама, старшынёй Зэльвенскага раённага Савета дэпутатаў.

Выбіраўся дэпутатам Зэльвенскага раённага Савета дэпутатаў дваццаць пятага, дваццаць шостага і дваццаць восьмага скліканняў. Дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання.

5 сакавіка 2021 года ўвайшоў у склад Канстытуцыйнай камісіі, якая ў мэтах ажыццяўлення рэзалюцыі шостага Усебеларускага народнага сходу распрацоўвае прапановы па змяненні Канстытуцыі Беларусі і забяспечвае іх усенароднае абмеркаванне.

Член Саюза пісьменнікаў Беларусі з 2016 года.

Вершы піша з 1974 года.

Друкаваўся не толькі ў раённых газетах “Праца”, “Бераставіцкая газета”, але і рэспубліканскіх выданнях: часопісе “Полымя” , “Маладосць”, “Вопросы управления”; штотыднёвіку “Літаратура і мастацтва”, газеце “Настаўніцкая газета”. Калектыўным зборніку “Зоры над Зальвянкай”.

У 2007 годзе асобныя вершы Валянціна Семянякі былі сабраны ў зборніку вершаў “На скрыжаванні”. У 2013 годзе выйшаў зборнік вершаў “Зорка залатая”, выдавецтва “Звязда”. У 2017 годзе прымаў удзел у Міжнародным конкурсе паэзіі і паэтычных перакладаў “Берега дружбы”. Валянцін Міхайлавіч перакладаў вершы з рускай на беларускую мову Уладзіміра Раманава – Члена Саюза пісьменнікаў Расіі.

Па выніках конкурсу была выдадзена кніга вершаў і паэтычных перакладаў у 3-х тамах “Силой общей любви – Беларусь-Россия – финалисты и наставники”, куды ўвайшлі вершы-пераклады і Валянціна Міхайлавіча.

Пазнейшыя вершы надрукаваны ў 2022 годзе ў літаратурным альманаху “На Нёманскай хвалі” і зборніку паэзіі, публіцыстыкі і прозы “Лучасць сэрцаў і дум”.

Узнагароджаны нагрудным знакам “Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь”.

**Бібліяграфія**


1. **Валянцін Семяняка** // Зоры над Зальвянкай: зборнік вершаў / Літ. аб’яд-не “Зоры над Зальвянкай”. — Слонім: Слонімская друкарня, 2008. — С. 87—95.
2. **Прайшла прэзентацыя паэтычнага зборніка Валянціна Семянякі «Зорка залатая»** [Электронный ресурс]. - Режим доступа: https://news.21.by/culture/2013/10/30/839097.html. - Дата обращения: 29.11.2022.
3. **Саўко, К. Чалавек з крылатай душою** / Кацярына Саўко ; Антаніна Скуба // Краязнаўчая газета. - 2020. — № 28. — С. 5.
4. **Семяняка Валянцін Міхайлавіч** // “Знакамітыя людзі Зэльвеншчыны – юбіляры 2018 года”: інфармацыйна-краязнаўчы буклет / ДУК “Зэльвенская раённая бібліятэка”; склад. С. В. Гецман. — Зэльва, 2018. — С. 8. — (Серыя "Краязнаўчы каляндар").
5. **Семяняка, В. Вогнішча : вершы** // Лучнасць сэрцаў і дум: паэзія, проза, публіцыстыка / уклад. Віктара Шніпа. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2022. С. 224—227. — (Беларусь літаратурная).
6. **Семяняка, В. М. Зорка залатая: вершы** / Валянцин Семяняка. — Минск: Выдавецки дом “Звязда”, 2013. — 112 с.
7. **Семяняка, В. Итоги : вершы** // На неманскай хвалі: літаратурны альманах. Заснаваны ў 2009 годзе № 7. — Гродна: ТАА “ЮрСаПрынт”, 2022. — С. 109—111.
8. **Семяняка, В. М. На скрыжаванні: вершы** / Валянцін Семяняка. — Зэльва: Зэльвенская цэнтральная раенная бібліятэка, 2007. — 85 с.
9. **Шматко, Я. Радкі, народжаныя сэрцам. У Зэльве адбылася сустрэча з паэтам-земляком Валянцінам Семянякам** [Электронный ресурс]. - Режим доступа: https://zelwa.by/radki-narodzhanyya-serczam-u-czentry-kultury-i-narodnaj-tvorchasczi-adbylasya-sustrecha-z-paetam-zemlyakom-valyanczinam-semyanyakam/. - Дата обращения: 29.11.2022.